УДК 37.013-053.6:37.017.4:94(476)(=161.3)

А. М. ПАЛУЯН
(г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны)

# РОЛЯ БЕЛАРУСАЗНАЎСТВА Ў ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ МОЛАДЗІ

Рэаліі сённяшняга дня пераканаўча сведчаць што прыярытэтным кірункам і складовай часткай адукацыйнага працэсу павінна стаць мэтанакіраванае і сістэмнае грамадзянска-патрыятычнае выхаванне, здольнае вырашыць задачу вяртання моладзі да вышэйшых духоўных каштоўнасцей, аснову якіх складае пачуццё любові да айчыны, яе гісторыі і культуры. У нашай рабоце мы прыходзім да высновы, што праз падрыхтоўку студэнтамі творчых праектаў з апорай агульнанацыянальны і лакальна-краязнаўчы матэрыял, выкарыстанне ўсіх аспектаў гісторыка-культурнай спадчыны, а таксама тэкстаў, сімвалаў, дат і персаналій мы можам стварыць адзіную выхаваўчую прастору, здольную забяспечыць комплекснасць, сістэмнасць і неперарыўнасць патрыятычна-выхаваўчага працэсу.

Працэс суверэнізацыі беларускай дзяржавы і сучасная сацыякультурная сітуацыя з настойлівасцю ставяць праблему грамадзянска-патрыятычнага выхавання. Нашай дзяржаве вельмі патрэбны не толькі добра падрыхтаваныя спецыялісты, але і патрыёты сваёй Радзімы, свядомыя грамадзяне. Рашэнне шэрагу праблем у развіцці краіны залежыць ад наяўнасці ў моладзі актыўнай грамадзянскай пазіцыі, адказнасці за сучаснасць і будучыню краіны. Праблема актуалізуецца і тым, што сучасны інфармацыйна-ідэалагічны рынак прапануе шырокі спектр палітычных, эканамічных, сацыяльных, духоўных, маральных і іншых ідэй. Але дамініраваць на гэтым рынку павінна менавіта агульна-нацыянальная ідэя – ідэя грамадзянскасці і патрыятызму. Сацыякультурная сітуацыя ў сённяшняй Беларусі характарызуецца таксама дыферэнцыяцыяй грамадства, дэвальвацыяй традыцыйных каштоўнасцей, ціскам масавай культуры з яе касмапалітычнымі і спажывецка-геданістычнымі падыходамі. На гэтым фоне назіраецца страта пэўнай часткай моладзі патрыятычнай свядомасці, гістарычнай памяці, здольнасці да арыентацыі ў свеце падзей і на рынку інфармацыйна-ідэалагічных паслуг. Вынікі даследаванняў сярод студэнтаў, праведзеныя аўтарам на розных факультэтах на працягу апошніх гадоў, засведчылі, што такія паняцці, як патрыятызм, павага да гістарычнага мінулага, культуры і мовы займаюць у сістэме каштоўнасцей адно з апошніх месцаў. Наогул, маладое пакаленне свядома аддае перавагу матэрыяльным дабротам, а духоўныя адыходзяць на аддалены план.

Рэаліі сённяшняга дня пераканаўча сведчаць што прыярытэтным кірункам і складовай часткай адукацыйнага працэсу павінна стаць мэтанакіраванае і сістэмнае грамадзянска-патрыятычнае выхаванне, здольнае вырашыць задачу вяртання моладзі да вышэйшых духоўных каштоўнасцей, аснову якіх складае пачуццё любові да айчыны, яе гісторыі і культуры.

Патрыятычнае выхаванне па сутнасці сваёй з'яўляецца нацыянальна-патрыятычным. У сучасных даследаваннях прасочваецца вяртанне да ідэй народнасці, далучэння да нацыянальнага вопыту на аснове патрыятычнага выхавання. Ідэя станаўлення маладога чалавека як грамадзяніна Айчыны атрымала адлюстраванне ў законах «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб правах дзяцяці» і інш. Прыярытэтнымі задачамі выхавання з'яўляецца фарміраванне патрыятызму і грамадзянскасці, заснаваных на любові да сваёй зямлі, мовы, народа, на павазе да гісторыі сваёй Радзімы, яе нацыянальнай культуры, традыцый і звычаяў; развіццё самасвядомасці асобы, яе здольнасці ўсведамляць сябе прадстаўніком свайго народа, сваёй краіны.

У вырашэнні выхаваўчай задачы найбольшым патэнцыялам валодаюць такія вучэбныя беларусазнаўчыя курсы, як "Беларусазнаўства", "Гісторыя і тэорыя культуры", "Фалькларыстыка", "Славянская міфалогія", "Беларуская мова (прафесійная лексіка)". Гэтыя курсы здольны раскрыць ментальныя асаблівасці, гісторыка-культурную спадчыну, нацыянальную ідэнтычнасць беларусаў ў кантэксце сусветных працэсаў. Пры іх выкладанні ўвага студэнтаў скіравана на пазнанне непаўторнасці гістарычнага шляху беларусаў,



РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЕНІ Ф. СКАРЫНЫ

адметнасць нашай матэрыяльнай і духоўнай культуры і яе месца ў еўрапейскай і славянскай культуры. Пытанні і праблемы, якія закранаюцца пры вывучэнні азначаных курсаў, скіраваны на фарміраванне асноў выхавання чалавека-грамадзяніна, гаспадара сваёй зямлі, адказнага за вынікі сваёй працы і за лёс сваёй краіны, за захаванне гістарычнай і нацыянальнай спадчыны.

Дысцыпліна «Беларусазнаўства», якая выкладаецца на філалагічным факультэце ў якасці курса па выбару, прадугледжвае веданне студэнтамі наступных праблем:

- фарміравання беларускага этнасу і развіцця нацыянальных меншасцей;
- фарміравання этнічнай тэрыторыі беларусаў;
- геаграфічнага становішча, прыродных умоў, экалагічнага стану і іх уплыву на беларусаў;
- складвання і развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў, супярэчлівасці іх развіцця ў розныя гістарычныя перыяды;
- гісторыі зараджэння і развіцця розных канфесій;
- фарміравання і развіцця нацыянальнай самасвядомасці беларусаў;
- складанасцей станаўлення беларускай дзяржаўнасці;
- атрыбутаў нацыянальнага суверэнітэту;
- з’яўлення і стану беларускай дыяспары;
- асаблівасцей жыццядзейнасці беларускага народа на фоне суседніх этнасаў.

Разам з тым курс па беларусазнаўству прадугледжвае набыццё студэнтамі ўменняў глыбока аналізаваць працэсы грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, духоўнага развіцця беларускага народа, панарамна ўсведамляць гістарычныя, этнаграфічныя, дэмаграфічныя і іншыя з’явы і падзеі, даваць ім навуковую ацэнку, здабываць з мінулага і выкарыстоўваць іх у сучасным у імя Бацькаўшчыны, пранікаць у сутнасць супярэчлівасцей грамадскага развіцця.

На аснове цэласнага курса «Беларусазнаўства» неабходна даць студэнтам інтэгратыўныя веды пра Беларусь і яе народ; дапамагчы ім усвядоміць адзінства, цэласнасць свету, узаемазалежнасць розных народаў і дзяржаў, прыярытэт агульначалавечых каштоўнасцей; садзейнічаць выхаванню ў студэнтаў пачуцця нацыянальнага патрыятызму.

Для многіх студэнтаў адкрыццём з’ўляецца інфармацыя пра першага беларуса-прэзідэнта Мікалая Судзілоўскага, які ў пачатку XX стагоддзя ўзначальваў сенат Гавайскіх астравоў, пра першага расійскага консула ў Японіі Іосіфа Гашкевіча, вядомага эксперыментатара ў галіне фізіятэрапіі Якуба Наркевіча-Ёдку, інжынера XVII стагоддзя, вынаходніка шматступеннай ракеты Казіміра Семяновіча, геолага Ігната Дамейку, у гонар якога названы адзін з партовых гарадоў Чылі (Пуэрта-Дамейка), вулканічны горны ланцуг у Андах, мінерал (дамейкіт), фіялка (віёла дамейкона), пастаўлены помнік ў Сант’яга, пра аўтара жывапісных і графічных работ на касмічныя тэмы Язэпа Драздовіча, заснавальніка параўнальнай эмбрыялогіі і фізіялогіі беспазваночных жывёл, эвалюцыйнай і эксперыментальнай гісталогіі Аляксандра Кавалеўскага і яго брата, заснавальніка эвалюцыйнай палеанталогіі Уладзіміра Кавалеўскага, перакладчыка, распрацоўшчыка рускай навуковай тэрміналогіі Ілью Капіевіча, лекарку і асветніцу Саламею Русецкую, мастака Івана Хруцкага, інжынера Мікалая Ястрэбскага, беларускага “бязбожніка” XVII стагоддзя Казіміра Лышчынскага, прафесара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, аўтара навукова-гістарычнага даследавання “Геаграфія Беларусі” Аркадзя Смоліча, народнага камісара земляробства Беларусі Дзмітрыя Прышчэпава, якога называюць “чырвоным Сталыпіным з Беларусі”, міністра замежных спраў СССР Андрэя Грамыку, матэматыка Барыса Кіта і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

У межах арганізацыі самастойнай кіруемай работы студэнтаў пры вывучэнні курса "Беларусазнаўства" можна шырока выкарыстоўваць такую форму работы, як падрыхтоўка творчых праектаў і мультымедыйных прэзентацый на краязнаўчую тэматыку: "Што ні край – то абычай" (аб адметных абрадах мясцовасці), "Мой родны кут у імёнах", "Мой родны кут у падзеях", "Архітэктурны летапіс маёй малой радзімы" і інш.

Значны выхаваўчы патэнцыял нясе збор матэрыялаў пра знакамітых землякоў – ураджэнцаў Гомельшчыны і іншых абласцей Беларусі. Напрыклад, студэнты з Добрушскага раёна падрыхтавалі цікавую прэзентацыю пра знакамітых людзей свайго краю: ураджэнца вёскі Жгунская Буда Уладзіміра Іванавіча Пракапцова, кандыдата мастацтвазнаўства, члена Саюза мастакоў і Саюза літаратурна-мастацкіх крытыкаў, дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь; ураджэнца вёскі Васільеўка Васілія Кузьміча Касцючэнку, палотны якога параўноўваюць з работамі Маціса, Брака, Дзюбуфе; беларускага кінарэжысёра, ураджэнца вёскі Карма Мікалая Арцёмавіча Калініна, якія вядомы па такіх фільмах, як "Корцік" і "Бронзавая птушка"; мастака-грымёра вышэйшай катэгорыі кінастудыі "Беларусьфільм", ураджэнца Добруша Рыгора Рыгоравіча Храпуцкага; доктара сельскагаспадарчых навук, былога загадчыка аддзела лясной таксацыі Інстыта лесу, ураджэнца вёскі Кругавец Фёдара Патапавіча Маісеенку; вядома вучонага ў галіне земляробства і глебазнаўства, ураджэнца Добруша Міхаіла Рыгоравіча Чыжэўскага; вядомага алгебраіста, аўтара навуковых прац па тэарэмах сілаўскага тыпу для бінарных груп, ураджэнца вёскі Дубовы Лог Сцяпана Апанасавіча Русакова; былога генеральнага дырэктара аб'яднання "Гомсельмаш" Мікалая Іванавіча Афанасьева, ураджэнца пасёлка Шабрынск.

Не менш цікавымі з'яўляюцца творчыя праекты студэнтаў пад агульнай назвай "Таленты Рэчыцкай зямлі". Яны прысвечаны вядомым літаратарам, лёс якіх цесна звязаны не толькі з Рэчыцай, але і з Гомельскім дзяржаўным універсітэтам: паэт і літаратуразнавец, кандыдат філалагічных навук Віктар Уладзіміравіч Ярац; паэт, эсэіст, крытык Анатоль Ціханавіч Сыс; паэт, публіцыст, журналіст Сяргей Анатольевіч Сыс; паэты Леанід Андрэевіч Пулькін і Віктар Іванавіч Стрыж.

Яшчэ адзін кірунак праектаў – мастакі Рэчыцкага краю. Гэта таленавіты мастак-графік Эдуард Канстанцінавіч Агуновіч, вядомы сваімі ілюстрацыямі да паэм Якуба Коласа "Новая зямля" і "Сымон-музыка", да раманаў І. Шамякіна "Глыбокая плынь" і "Трывожнае шчасце". Сапраўдную славу Э. Агуновічу прынесла афармленне экспазіцый музеяў самага рознага профілю, у прыватнасці Літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа, Літаратурнага музея Янкі Купалы ў Мінску і яго філіялаў у Вязынцы і Акопах, Літаратурнага музея Максіма Багдановіча ў Траецкім прадмесці. Эдуард Агуновіч – аўтар праектаў некалькіх помнікаў у роднай Рэчыцы: капліца Еўфрасінні Полацкай на беразе Дняпра, помнік Мітрафану Доўнар-Запольскаму, воінам-інтэрнацыяналістам.

Асобны праект прысвечаны аўтару каля 500 жывапісных палотнаў і соцень графічных работ Аляксандру Анатольевічу Ісачову, творчасць якога стала сенсацыяй не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Сваё слова ў жывапісе сказаў і яго сын – Яраслаў Аляксандравіч Ісачоў, выпускнік геолага-геаграфічнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Пранікнёная прыгажосць прастораў роднай зямлі і неба адлюстравана на пейзажных палотнах Уладзіміра Міхайлавіча Капшая, Віктара Рыгоравіча Асіпенкі, Уладзіміра Філіпавіча Гурскага, Аляксандра Сяргеевіча Пясецкага, Леаніда Паўлавіча Абрамовіча. Пад уплывам А. Ісачова асноўнай тэмай твораў Валерыя Пятровіча Бандарчука сталі міфалагічныя і біблейскія сюжэты. Шматзначнасць вобразаў, гульня метафар і асацыяцый характарызуюць работы такіх рэчыцкіх мастакоў, як Вадзім Аляксеевіч Стральчэня, Леанід Васільевіч Хобатаў, Васіль Васільевіч Пачыцкі, Яўген Эдуардавіч Шаціхін і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Не менш багатая Рэчыцкая зямля і на навуковыя таленты. Менавіта ў Рэчыцы нарадзіўся будучы вядомы юрыст, адзін з лепшых расійскіх адвакатаў, публіцыст, літаратуразнаўца і грамадскі дзеяч Уладзімір Данілавіч Спасовіч, які стаў прататыпам адваката Фецюкевіча ў рамане Ф. М. Дастаўскага "Браты Карамазавы". А яшчэ адзін ураджэнец Рэчыцы – Мікалай Фёдаравіч Ястржэмбскі – быў не толькі вядомым інжынерам-будаўніком, механікам, але і таленавітым літаратарам: змог напісаць і выдаць за арыгінал тры раздзелы другога тома "Мёртвых душ" М.Гогаля. Рэчыцкая зямля падарыла такіх вядомых фізікаў, як Дзмітрый Рыгоравіч Лін, Натан Барысавіч Варгафтык, Барыс Міхайлавіч Бяркоўскі і інш.

Увесь прадастаўлены студэнтамі ў выніку падрыхтоўкі праектаў матэрыял можа шырока выкарыстоўвацца падчас іх далейшай працы ў школах, гімназіях, каледжах. Дзякуючы такой творчай рабоце мы імкнёмся стварыць адзіную выхаваўчую прастору, здольную забяспечыць комплекснасць, сістэмнасць і неперарыўнасць патрыятычна-выхаваўчага працэсу. Дасягненне мэты могуць забяспечыць спалучэнне дырэктыўных і ініцыятыўных пачаткаў, вучэбнага і пазавучэбнага працэсаў, апора на агульнанацыянальны і лакальна-краязнаўчы матэрыял, выкарыстанне ўсіх аспектаў гісторыка-культурнай спадчыны, а таксама тэкстаў, сімвалаў, дат і персаналій. Важным з'яўляецца і суаднясенне беларускіх патрыятычных каштоўнасцей з агульнаславянскімі і агульначалавечымі.

**Спіс літаратуры**


1 Асветнікі зямлі беларускай: Энцыклапед. даведнік / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў і інш.; 2-е выд. – Мн.: БелЭн, 2006. – 496 с.

2 Беларусы: У 8 т. / Рэдкал.: В. К. Бандарчык і інш. – Мн.: Беларуская навука, 1999–2005.

3 Грыцкевіч В. Гісторыя, самасвядомасць, этнас // Маладосць. – 1994. – №№ 3–4.

4 Дубянецкі, Э. С. Беларускі нацыянальны характар: спробы даследавання / Э. С. Дубянецкі // Адукацыя і выхаванне. – 1995. – № 5. – С. 29–39.

5 Зам А. Белорусы – опыт самоидентификации / А. Зам // Неман. – 1995. – № 5. – С. 136–147.

6 Зямля чароўная дабра: Добрушскі край: гісторыя і сучаснасць / пад агульнай рэд. А. А. Станкевіч. – Гомель: ААТ "Полеспечать", 2008. – 280 с.

7 Мяснікоў, А. Ф. Сто асоб беларускай гісторыі: гістарычныя партрэты / Анатоль Мяснікоў. – 2-е выд., дапрац. – Мінск: Літаратура і мастацтва, 2009. – 344 с.

8 Речица. Дорогой столетий в будущее / Лебедева В. М., Голубев В. Ф., Киштымов А. Л. [и др.]. – Речица. Редакция газеты «Дняпровец», 2013. – 407 с.



УДК 821.162



С. І. САМАХВАЛ
(Мінск, БДУ)


## НЕКАТОРЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ЎСПРЫМАННЯ ТВОРЧАСЦІ ЯКУБА КОЛАСА Ў БАЛГАРЫІ


Разглядаюцца асноўныя этапы рэцэпцыі творчасці Я. Коласа ў Балгарыі, раскрываюцца і аналізуюцца тыя бакі творчасці, якія вылучаліся на розных этапах балгарскай літаратурнай крытыкай. Даследаванне дазваляе ацаніць магутнасць таленту беларускага класіка і яго магчымы ўплыў на балгарскі літаратурны працэс і крытыку. Дадзены аналіз творчасці пісьменніка ў Балгарыі дапамагае раскрыць і найбольш правільнае і дакладнае ўяўленне пра значанасць беларускай літаратуры за мяжой.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ